# ТЭМАТЫЧНЫЯ ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

## *Займеннік*

Засвоіць любую мову можна толькі ў выніку яе мэтанакіраванага і сістэматычнага вывучэння. У школьным курсе беларускай мовы цэнтральнае месца займае граматыка, якая ўключае ў сябе марфалогію і сінтаксіс. Марфалогія – вучэнне пра формы слова, пра лексіка-граматычныя класы слоў. Школьны курс марфалогіі дапамагае вучням практычна авалодаць навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, арфаграфічнымі, пунктуацыйнымі, стылістычнымі ўменнямі. Пры вывучэнні марфалогіі вырашаецца найважнейшая метадычная задача фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў. На ўроках марфалогіі вучні асэнсоўваюць моўныя з’явы ў адзінстве іх значэння, формы і функцыі, авалодваюць моўнымі сродкамі з пункту гледжання іх прызначэння і выкарыстання ў разнастайных відах маўленчай дзейнасці.

Пры вывучэнні такой часціны мовы, як займеннік (як і пры вывучэнні любой іншай часціны мовы), вучні ўдасканальваюць свае кагнітыўныя здольнасці. Займеннікі складаюць лексічна абмежаваную групу слоў, аднак патрэба і магчымасці іх ужывання ў мове надзвычай вялікія. Гэта тлумачыцца тым, што кожны займеннік мае абагульнена-ўказальнае значэнне і не называе канкрэтных прадметаў, іх прымет або колькасці. У час працы над займеннікам ад школьнікаў патрабуецца высокі ўзровень абстрагавання і абагульнення. Асноўнымі прыёмамі пры авалоданні граматычнымі прыметамі займеннікаў розных разрадаў з’яўляюцца такія разумовыя аперацыі, як параўнанне, аналіз, сінтэз, абагульненне, індукцыя, дэдукцыя, сістэматызацыя і інш.

Вывучэнне любой часціны мовы на ўроках адбываецца па пэўным плане: агульнае катэгарыяльнае значэнне слоў пэўнай часціны мовы, яе асноўныя марфалагічныя катэгорыі, спалучальнасць слоў лексіка-граматычнага разраду з іншымі словамі, сінтаксічная функцыя і інш. На факультатыўных занятках па падрыхтоўцы да алімпіяды план ўзнаўлення і замацавання матэрыялу можа быць зменены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**1.** Укажыце побач у дужках часцінамоўную прыналежнасць слова *сам* (*сама*).

1. Сама (____) ты, Радзіма, жывая паэма… (П. Глебка).

2. [Бабка:] – Ой, хоць бы ўжо хутчэй сам (____) прыйшоў. Сам – гэта, канечне, бацька (І. Сяркоў).

3. Сам (_____) Банадысь, высокі, у новым кажушку, … ішоў побач з канём (К. Чорны).

4. Як ні разважала [Хадоська], усё выходзіла: сама (____) лепш, пэўна, тут, у Юравічах, астацца (І. Мележ).

5. Цёплая майская ноч п’яніла галовы духмяным пахам квецені – сама (_____) што цвілі сады (А. Александровіч.)

**2**. Устанавіце адпаведнасць паміж значэннем слова *свой* (*свая*) і сказам, у якім рэалізуецца гэта значэнне.

| | *Значэнне* | | *Сказ* |
|---|---|---|---|
| А | ‘які выконваецца, робіцца, здабываецца і пад. самім, самастойна, без чыёй-небудзь дапамогі’ | 1 | Пабудаваць сваю хату. |
| Б | ‘уласцівы толькі дадзенай асобе або прадмету; своеасаблівы’ | 2 | У кожнага сваё... (У. Шыцік). |
| В | ‘які з’яўляецца асабістай маёмасцю, набыткам; уласны’ | 3 | [Салдаты] … аб нечым надта ўжо гарача спрачаліся і крычалі на сваёй мове (У. Дамашэвіч). |
| Г | ‘які знаходзіцца ў сваяцкіх, сяброўскі або іншых блізкіх адносінах’ | 4 | Шчабечуць песню сваю мітуслівыя ластаўкі… (Я. Брыль). |
| | | 5 | Свой бацька насварыцца і пашкадуе (Прыказка) |
| | | 6 | Але ў жыцці ўсяму свая адведзена мера (М. Ракітны). |

**3.** Аднавіце займеннікі ў беларускіх прыказках, падбярыце да іх рускія адпаведнікі.

1. Каб вады напіцца, трэба ____ пакланіцца.
2. Прыйдзе тата і _____ свята.
3. _____ сястрыцы па завушніцы.
4. На ўсё ____ час.
5. І _____ не абораю хлеб кроім.
6. Яшчэ ____ не спаткаўся, каб усім ён спадабаўся.
7. Якое карэнне, ______ і насенне.
8. Не маё гарыць – не _____ тушыць.
9. Адзін хоча сёе, другі – ____.
10. Не ў _____ карыта не лезь.

**4**. Запішыце 10 фразеалагізмаў, у складзе якіх ёсць кампаненты-займеннікі. Патлумачце значэнне.

**5**. У прапанаваных фразеалагізмах выдзеленыя займеннікі-кампаненты пададзены няправільна. Запішыце правільны варыянт кожнага выдзеленага займенніка-кампанента, укажыце разрад. Растлумачце значэнне фразеалагічных адзінак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Не сысці *ёй* з гэтага месца. Між *сваімі* кажучы.

2. Выклікаць агонь на *яго* . Несці *яе* высока. Браць *сваё* ў рукі.

3. Адплаціць *сваёй* жа манетай. Не на *сваёй* вуліцы жыць. *Нейкімі* днямі.

4. *Нейкая* бура прынесла. *Якісьці* вецер занёс.

5. На *свае* бакі. З *маёй* душой. Пад *сваю* бочку шпунт.

6. Вочы б *свае* не бачылі. Баяцца *ягонага* ценю.

7. *Маё* ліха не бярэ. Зводзіць на *нешта* .

8. *Усё* ў лесе здохла.

**6**. Запішыце сказы, замяніўшы выдзеленыя займеннікі, сінанімічнымі.

1. Ганна ўбачыла блізка закаханы, гарачы позірк *яго* (І. Мележ).

2. "Манькай" у *іхняй* вёсцы называюць левую руку … (Я. Брыль).

3. Танцавала Зіна лёгка, папярэджваючы *кожны* рух партнёра (У. Шыцік).

4. Лукаша як быццам *нешта* затрымлівала (П. Кавалёў).

5. Гітлераўцы *любымі* сіламі намагаліся сарваць пераправу (І. Шамякін).

6. З заводскага двара выязджала *нечая* запозненая машына (Я. Скрыган).

7. Заўтра ў мяне адзін урок, падменіць *хто-кольвек* (А. Марціновіч).

8. Спатрэбіцца *што*, звяртайцеся да мяне.

9. А хлопцы, дык хлопцы – гвардзеец *любы*! (Янка Купала)

10. І раптам – быццам узмахнуў рукой *якісь* чарадзей – луг зноў набыў сваю ўчарашнюю прывабнасць (К. Кірэенка).

**7.** Запішыце тэкст, замяніўшы займеннікі *1 асобы* займеннікамі *3 асобы*. Патлумачце, як уплывае такая замена на агульны характар апавядання.

Упершыню я ехаў на легендарнае возера Нарач. Ехаў не толькі па справах – хацелася на свае вочы пабачыць мясціны, так велічна апетыя Максімам Танкам, а ўслед за ім іншымі паэтамі. Я загадзя рыхтаваўся да тых уражанняў, якія, здагадваўся, мяне сустрэнуць. Мне ўяўляўся казачна-задумны бор, пра які расказваў Янка Брыль: высока над нарачанскімі водамі, дзе рэха з вялікім лёскатам доўга ідзе да другога берага і не памірае, а вяртаецца назад памаладзелым і памножаным на бясконцы гоман хваляў (К. Кірэенка. "Заўсёды з Радзімай".)

**8.** Замяніце ў сказе займеннік *свой* іншымі прыналежнымі займеннікамі. Патлумачце, у якім сказе замена немагчымая і чаму.

1. Я выконваю свае абавязкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Мы выконваем свае абавязкі.
3. Ты выконваеш свае абавязкі.
4. Вы выконваеце свае абавязкі.
5. Ён выконвае свае абавязкі.

**9**. Запоўніце пустыя радкі табліцы.

| *Словаўтваральная база* | *Вытворны займеннік* | *Спосаб утварэння* |
|---|---|---|
| іх | | суфіксальны |
| хто | хто-небудзь | |
| | нешта | прыставачны |
| нічый | | суфіксальны |
| сёй, той | сёй-той | |
| | ягоны | суфіксальны |
| | якісьці | постфіксальны |
| які | | прыставачны |
| чый | нечы | |
| што, нішто | | словаскладанне |

**10**. А. Якія лацінскія літары, іх назвы і ўтварэнні ад гэтых назваў набываюць у тэксце значэнне займеннікаў.

Б. Растлумачце значэнне выдзеленых слоў у сказах.

1. На заставе *энскай*, На застрэшку гор – Хлопцы са Смаленска І адзін маёр (Ю. Голуб).

2. І ўсё ж сваёй шчодрай рукой Выдала [восень-бухгалтарка], згодна з патрэбамі, *Энную* суму для ўцехі людской… (Г. Кляўко).

**11**. Агульнавядома, што паводле стылістычнай афарбоўкі займеннікі – гэта, як правіла, стылістычна нейтральныя словы. Выключэнне складаюць адзінкі з памяншальнымі або ласкальнымі мадыфікацыйнымі суфіксамі.

А. Замяніце выдзелены займеннік у сказе нейтральнай формай. Патлумачце, якія адбываюцца змены ў змесце сказа.

Стары Ярмалінскі кляўся і бажыўся, што "*нічагуткі*, каб я з гэтага месца не сышоў, не ведаю" (К. Чорны).

Б. Запішыце прыклады стылістычна афарбаваных займеннікаў.

**12**. Да рускіх прыказак падбярыце беларускія адпаведнікі. У беларускіх адпаведніках укажыце склон займеннікаў.

1. Всякий купец хвалит свой товар.
2. Всяк петух смел на своей навозной куче.
3. Дома стены помогают.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

4. Не ошибается тот, кто ничего не делает.
5. По одёжке встречают, по уму провожают.
6. По труду и честь.
7. Ранняя птичка носок прочищает, а поздняя глазки продирает.
8. Умелые руки не знают скуки.
9. У страха глаза велики.
10. Чего сам не любишь, того и другому не желай.
11. Чем богаты, тем и рады.
12. Что посеешь, то и пожнёшь.

**13**. Размяркуйце займеннікі (у тым ліку і канструкцыі з займеннікамі) па слупках табліцы.

| **Пішуцца разам** | **Пішуцца асобна** | **Пішуцца праз злучок** |
|---|---|---|
| | | |

(Не)хта, (не)шта, (не)кага, (не)чага, (не)каму, (не)йчы; (не)каму, а вам будзе лепш; (ні)хто, (ні)што, (ні)чый, (ні)чым, (ні)ў кога, (ні)да чаго, (ні)ў якія; хто(сьці), што(сь), які(сьці), чый(сь); абы(хто), абы(чый), хто(небудзь),чаго(небудзь), (абы)з чым, (абы)да каго, (ні)ў чым.

**14**. Замест кропак устаўце займеннік *сябе* або *сабе*.

1. Сам ад … не пабяжыш упрочкі, … самога цяжка перагнаць (С. Грахоўскі). 2. Як у … нічога не мае, то на … найбольш чапляе (Прыказка). 3. Пчолка ўсю … аддае вялікаму зямному жыццю (П. Пестрак). 4. Васіль ведаў … , верыў … , і амаль ніколі гэта вера не падводзіла яго (А. Кудравец). 5. Лес, дзе знаходзіўся штаб, сам па … невялікі, але надзвычай густы (М. Ваданосаў). 6. Антось глядзеў і пацяшаўся і ціха сам … смяяўся (Якуб Колас). 7. Патрабавальны да … , І. Мележ і ў другіх цаніў перш за ўсё талент, працавітасць, сумленнасць, прынцыповасць (П. Панчанка).

**15**. Запішыце сказы (загадкі), падкрэсліце займеннікі ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй. Запішыце адгадкі.

1. Усіх нас корміць, а сама есці не просіць.
2. Ніхто іх не палохае, а яны дрыжаць.
3. Колькі на небе зорачак, столькі на зямлі дзірачак.
4. За намі ўслед шагае, ды нам ні ў чым не памагае.
5. Без языка, а крычыць, ніхто яго не бачыць, а ўсякі чуе.
6. Хто мяне заб’е, той сваю кроў пралье.
7. Што ў вадзе сохне, а ў агні мокне?
8. У лесе вырасла, з лесу вынеслі, у руках плача, а хто пачуе, той скача.
9. Вечарам прыляціць, усю ноч на зямлі праляжыць, а раніцай на неба зноў паляціць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Што на сабе не ўчуеш?

**16**. Аднавіце радкі Максіма Танка, выбраўшы патрэбны займеннік з прапанаваных у дужках варыянтаў.

Запішыце фразеалагізм, які творча пераасэнсоўвае М. Танк. Укажыце значэнне і этымалогію фразеалагічнай адзінкі.

(Я, ён, нехта) спытаў чалавека,
(Які, хто, каторы) прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
– Што самае цяжкое
На (гэтым, нашым, тым) свеце?
І (я, ён, нехта) адказаў:
– Прайсці праз вернасць (М. Танк).

## ДАВЕДКІ

**1.**

1. Сама (*займеннік*) ты, Радзіма, жывая паэма… (П. Глебка).

2. [Бабка:] – Ой, хоць бы ўжо хутчэй сам (*назоўнік*) прыйшоў. Сам – гэта, канечне, бацька (І. Сяркоў).

3. Сам (*займеннік*) Банадысь, высокі, у новым кажушку, … ішоў побач з канём (К. Чорны).

4. Як ні разважала [Хадоська], усё выходзіла: сама (*часціца*) лепш, пэўна, тут, у Юравічах, астацца (І. Мележ).

5. Цёплая майская ноч п’яніла галовы духмяным пахам квецені – сама (*часціца)* што цвілі сады (А. Александровіч.)

**2.**

А4Б6В1Г5

**3**.

1. Каб вады напіцца, трэба *ёй* пакланіцца = без труда не вытащишь и рыбку из пруда.

2. Прыйдзе тата і *наша* свята = будет и на нашей улице праздник.

3. *Кожнай* сястрыцы па завушніцы = всем сестрам по серьгам.

4. На ўсё *свой* час = всему своё время.

5. І *мы* не абораю хлеб кроім = и мы не лыком шиты.

6. Яшчэ *гэткі* не спаткаўся, каб усім ён спадабаўся = ещё такой не родился, кто бы всем сгодился.

7. Якое карэнне, *такое* і насенне = каково семя, таково и племя.

8. Не мае гарыць – не *мне* тушыць = моя хата с краю – ничего не знаю.

9. Адзін хоча сёе, другі – *тое* = на вкус и цвет товарищей нет.

10. Не ў *сваё* карыта не лезь = не в свои сани не садись.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**4.**

1. На ўвесь мах – ‘вельмі хутка, з вялікай скорасцю’;

2. МерацЬ на свой аршын – ‘меркаваць пра каго-, што-небудзь вельмі суб’ектыўна, аднабакова, з асабістага пункту гледжання’;

3. Ні сысці мне з гэтага месца – ‘клятвеннае запэўненне ў чым-небудзь’;

4. Набіраць сабе ў галаву – ‘упарта трымацца якой-небудзь думкі, намеру’;

5. Паміж намі – ‘строга сакрэтна’;

6. Называць рэчы сваімі імёнамі – ‘гаварыць адкрыта, нічога не ўтойваючы пра каго-, што-небудзь’;

7. І нашым і вашым – ‘адным і другім адначасова’;

8. Не нашага поля ягада – ‘не раўня каму-небудзь, зусім чужы (па становішчы, паводзінах, духу і пад.)’;

9. Па самае нельга – ‘спаўна, як толькі можна (рабіць, зрабіць што-небудзь)’;

10. Несці сябе высока – ‘трымацца высакамерна, ганарліва’.

**5.**

1. Не сысці мне (асабовы) з гэтага месца (‘клятвеннае запэўненне ў чым-небудзь’). Між намі (асабовы) кажучы (‘пад сакрэтам’).

2. Выклікаць агонь на сябе (зваротны) (‘адцягваць увагу, прымаць на сябе самае цяжкае’) . Несці сябе (зваротны) высока (‘трымацца высакамерна, ганарліва’). Браць сябе (зваротны) ў рукі (‘супакойвацца’).

3. Адплаціць той (указальны) жа манетай (‘адказваць тым самым, такімі ж адносінамі, учынкамі’). Не на той (указальны) вуліцы жыць (‘не так, як трэба’). Гэтымі (указальны) днямі (‘вельмі хутка, у бліжэйшы час, нядаўна’).

4. Якая (пытальна-адносны) бура прынесла (‘з якой мэтай ідзе’). Які (пытальна-адносны) вецер занёс (‘пры якіх абставінах аказаўся хто-небудзь дзе-небудзь’).

5. На усе (азначальны) бакі (‘усяляк, усебакова’). З усёй (азначальны) душой (‘з вялікай радасцю, з ахвотай’). Пад кожную (азначальны) бочку шпунт (‘той, хто любіць умешвацца ў многія справы’).

6. Вочы б мае (прыналежны) не бачылі (‘зусім не хочацца сустракаць, заўважаць, бачыць каго-небудзь, што-небудзь’; ‘пра непрыемнае, агіднае’). Баяцца свайго (прыналежны) ценю (‘трымацца занадта асцярожна’).

7. Ніякае (адмоўны) ліха не бярэ (‘нічога не здараецца з кім-небудзь’). Зводзіць на нішто (адмоўны) (‘пазбаўляць усялякага значэння, сэнсу’).

8. Нешта (няпэўны) у лесе здохла (‘здарылася што-небудзь неспадзяванае’).

**6.**

1. Ганна ўбачыла блізка закаханы, гарачы позірк *ягоны*.

2. “Манькай” у *іх* вёсцы называюць левую руку …

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Танцавала Зіна лёгка, папярэджваючы *любы* (*усякі*) рух партнёра.

4. Лукаша як быццам *штосьці* затрымлівала.

5. Гітлераўцы *ўсімі* (*усякімі*) сіламі намагаліся сарваць пераправу.

6. З заводскага двара выязджала *чыясьці* запозненая машына.

7. Заўтра ў мяне адзін урок, падменіць *хто-небудзь*.

8. Спатрэбіцца *што-небудзь*, звяртайцеся да мяне.

9. А хлопцы, дык хлопцы – гвардзеец *кожны*!

10. І раптам – быццам узмахнуў рукой *нейкі* чарадзей – луг зноў набыў сваю ўчарашнюю прывабнасць.

**7.**

Упершыню ён ехаў на легендарнае возера Нарач. Ехаў не толькі па справах – хацелася на свае вочы пабачыць мясціны, так велічна апетыя Максімам Танкам, а ўслед за ім іншымі паэтамі. Ён загадзя рыхтаваўся да тых уражанняў, якія, здагадваўся, яго сустрэнуць. Яму ўяўляўся казачна-задумны бор, пра які расказваў Янка Брыль: высока над нарачанскімі водамі, дзе рэха з вялікім лёскатам доўга ідзе да другога берага і не памірае, а вяртаецца назад памаладзелым і памножаным на бясконцы гоман хваляў.

*Пры замене займеннікаў 1 асобы на займеннікі 3 асобы аслабляецца значэнне асабістага ўдзелу ў апісаных падзеях, змяншаецца эмацыянальнасць выказвання.*

**8.**

1. Я выконваю *мае* абавязкі.

2. Мы выконваем *нашы* абавязкі.

3. Ты выконваеш *твае* абавязкі.

4. Вы выконваеце *вашы* абавязкі.

У 5-м сказе замена немагчымая. Калі замяніць *свае* (абавязкі) на *яго* (абавязкі), то атрымаецца, што ён выконвае абавязкі каго-небудзь іншага.

**9.**

| *Словаўтваральная база* | *Вытворны займеннік* | *Спосаб утварэння* |
|---|---|---|
| іх | іхні | суфіксальны |
| хто | хто-небудзь | постфіксальны |
| што | нешта | прыставачны |
| нічый | нічыйны | суфіксальны |
| сёй, той | сёй-той | словаскладанне |
| яго | ягоны | суфіксальны |
| які | якісьці | постфіксальны |
| які | абы-які (нейкі, ніякі) | прыставачны |
| чый | нечы (нічый, абы-чый) | прыставачны |
| што, нішто | што-нішто | словаскладанне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**10**.

Значэнне займеннікаў могуць набываць у тэксце лацінскія літары *x*, *y*, *z*, вялікая літара *N*, назвы гэтых літар – *ікс*, *ігрэк*, *зэт*, *эн*, а таксама прыметнікі, утвораныя ад назвы літары *N* – *энны*, *энскі*, назоўнік *Энск*, напрыклад: містэр Ікс, горад Энск, службу праходзіў у энскім палку, энны час правёў за мяжой.

1. На заставе *энскай* (‘*нейкай*’), На застрэшку гор – Хлопцы са Смаленска І адзін маёр (Ю. Голуб).

2. І ўсё ж сваёй шчодрай рукой Выдала [восень-бухгалтарка], згодна з патрэбамі, *Энную* (‘*нявызначанай велічыні, колькасці*’) суму для ўцехі людской… (Г. Кляўко).

**11.**

А. Стары Ярмалінскі кляўся і бажыўся, што “*нічога*, каб я з гэтага месца не сышоў, не ведаю”.

Пры замене выдзеленага займенніка *нічагуткі* на нейтральную форму *нічога* выразна аслабляецца значэнне катэгарычнага, узмоцненага адмаўлення (нічагуткі – ‘*зусім, абсалютна нічога*’).

Б. *Усенькі, такусенькі, нічагусенька, нічагусенькі, нештачка, саменькі* і інш.

**12**.

1. Кожны (Н.) стралец сваю (В.) стрэльбу хваліць. Кожны (Н.) цыган сваю (В.) кабылу хваліць. Кожны (Н.) пастух сваёй (В.) пугай хваліцца.

2. У сваім (М.) гарадзе роўны ваяводзе. На сваім (М.) падворку і верабей гаспадар. На сваім (М.) сметніку і певень смелы.

3. У сваёй (М.) хаце і вуглы памагаюць. У сваёй (М.) хаце і дзіркі грэюць.

4. Той (Н.) не памыляецца, хто (Н.) ад працы хіляецца. Хто (Н.) сядзіць, той (Н.) не спатыкаецца. Хто (Н.) бяжыць, той (Н.) і спатыкаецца.

5. Пазнаюць нашу (В.) дачку і ў андарачку.

6. Якая (Н.) справа, такая (Н.) і слава. Таго (Р.) на кут, у каго (Р.) мазалі цвярдзейшыя.

7. Хто (Н.) да сонца ўстае, таму (Д.) бог дае. Хто (Н.) рана ўстае, таму (Д.) хлеба стае.

8. Хто (Н.) працуе, той (Н.) не сумуе. Хто (Н.) працуе, той (Н.) святкуе. Каму (Д.) праца служыць, той (Н.) не пра што (В.) не тужыць.

9. Хто (Н.) баіцца, таму (Д.) ўваччу дваіцца.

10. Чаго (Р.) не хочаш самому (Д.), не чыні другому.

11. Чым (Т.) хата багата, тым (Т.) і рада. Частавалі, чым (Т.) мелі, весялілі, як умелі. Што (В.) маем, тым (Т.) і прымаем.

12. Кінь за сабою (Т.), знойдзеш перад сабою (Т.). Хто (Н.) арэ ды сее, той (Н.) малоціць і вее. Як дбаеш, так і маеш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**13**.

| Пішуцца разам | Пішуцца асобна | Пішуцца праз злучок |
|---|---|---|
| Нехта, нешта некага, нечага, некаму, нейчы, ніхто, нішто, нічый, нічыім, хтосьці, штось, якісьці, чыйсь | Не каму, а вам будзе лепш; ні ў кога, ні да чаго, ні ў якія, абы з чым, абы да каго, ні ў чым | Абы-хто, абы-чый, хто-небудзь,чаго-небудзь |

**14.**

1. Сам ад сябе не пабяжыш упрочкі, сябе самога цяжка перагнаць (С. Грахоўскі). 2. Як у сабе нічога не мае, то на сябе найбольш чапляе (Прыказка). 3. Пчолка ўсю сябе аддае вялікаму зямному жыццю (П. Пестрак). 4. Васіль ведаў сябе , верыў сабе , і амаль ніколі гэта вера не падводзіла яго (А. Кудравец). 5. Лес, дзе знаходзіўся штаб, сам па сабе невялікі, але надзвычай густы (М. Ваданосаў). 6. Антось глядзеў і пацяшаўся і ціха сам сабе смяяўся (Якуб Колас). 7. Патрабавальны да сябе , І. Мележ і ў другіх цаніў перш за ўсё талент, працавітасць, сумленнасць, прынцыповасць (П. Панчанка).

**15**.

1. Усіх нас корміць, а сама есці не просіць (Зямля).
2. Ніхто іх не палохае, а яны ўсё дрыжаць (Лісце асіны).
3. Колькі на небе зорачак, столькі на зямлі дзірачак (Іржышча).
4. За намі ўслед шагае, ды нам ні ў чым не памагае (Цень).
5. Без языка, а крычыць, ніхто яго не бачыць, а ўсякі чуе (Рэха).
6. Хто мяне заб'е, той сваю кроў пральле (Камар).
7. Што ў вадзе сохне, а ў агні мокне? (Воск).
8. У лесе вырасла, з лесу вынеслі, у руках плача, а хто пачуе, той скача (Скрыпка).
9. Вечарам прыляціць, усю ноч на зямлі праляжыць, а раніцай на неба зноў паляціць (Раса).
10. Што на сабе не ўчуеш? (Як расцеш; рост).

**16**.

Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
– Што самае цяжкое
На гэтым свеце?
І ён адказаў:
– Прайсці праз вернасць (М. Танк).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*У вершы аўтар творча пераасэнсоўвае фразеалагізм прайсці праз агонь і ваду і медныя трубы – г. зн. многа зведаць у жыцці, пабыць у розных цяжкіх абставінах. Першапачатковая вобразнасць фразеалагізма ўсведамляецца як "быць у агні і не згарэць, быць у вадзе і не патануць". Ва ўсходнеславянскіях мовах выраз ўжываецца з дадаткам "медныя трубы" – вобразам, вядомым яшчэ ў Старажытнай Грэцыі як сімвал урачыстасці з аркестрам. Прайсці медныя трубы – г. зн. прайсці цераз славу.*

Святлана Мароз,
Марына Ржавуцкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ